УДК 94(476):«1874/1914»

# ПАСТАНОВЫ СЕЛЬСКІХ СХОДАЎ БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ АБ АБМЕЖАВАННІ П’ЯНСТВА У КАНЦЫ XIX – ПАЧАТКУ XX СТСТ.: МЕХАНІЗМ ДЗЕЯННЯ І ПРАБЛЕМА ІНТЭРПРЭТАЦЫІ

***Сяргей Мяньчэня***

*Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь*

У артыкуле разглядаецца эвалюцыя механізма забароны кропак продажу моцных напояў у сельскай мсцовасці і дзяржаўнай палітыкі ў дачыненні да гэтых пастаноў. Дадзеныя пастановы неадназначна ўспрымаюцца навукоўцамі, бо яны не заўсёды адпавдалі ідэям барацьбы з п’янствам і прымаліся пад уздзеяннем эканамічных фактараў і адміністрацыйнага ціску.

***Ключавыя словы: п’янства, сельскія сходы, вінная манаполія***

Репозиторий ПолесГУ

Рэгуляванне спажывання алкагольных напояў ва ўмовах сельскай грамады ажыццяўлялася на аснове калектыўнага кантроля. У сялянскім асяроддзі само па сабе ўжыванне алкаголя не лічычася заганай, калі толькі не перарастала ў празмернае і вяло да разбурэння гаспадаркі і правапарушэнняў. У 70-я гг. XIX ст. дадзены кантроль атрымлівае юрыдычнае афармленне. У 1874 сельскія грамады атрымалі права даваць дазвол на існаванне піцейных установ ці забараняць іх на сваёй тэрыторыі, падобныя правы атрымалі і гарады – гарадская дума магла вызначыць вызначаць колькасць месц продажу моцных напояў ці забараняць продаж у пэўнай мясцовасці [1, с. 85]. Грамада ад дазволу на размяшчэнні на сваёй зямлі атрымлівала арэндную плату, аднак часта гэты прыбытак нівеліраваўся тымі грашыма, што сяляне неслі ў карчму. Ужо ў 1885 г. у гарадоў і сельскіх грамад адабралі права даваць дазвольныя пастановы, але сельскія грамады захавалі права на 3 гады забараняць продаж алкагольных напояў на сваёй тэрыторыі. 5 мая 1892 г. права дазвольных пастаноў было вернута, але, разам з тым, уведзена забарона на канцэнтрацыю ў адных руках значнай колькасці піцейных установ [2, с. 312].

Увядзенне дзяржаўнай віннай манаполіі, якое паступова пачалося з 1894 г. (на тэрыторыі беларускіх губерняў з 1897 г.) прадугледжвала стварэнне сеткі дзяржаўных вінных крам – манаполек, якія б ажыццяўлялі вынасны продаж гарэлкі. Стварэнне манаполек ставіла сваёй мэтай барацьбу з празмерным злоўжываннем алкаголем – рэгламентаваўся час продажу і яго ўмовы (толькі за грошы і дарослым); а таксама нелегальным продажам – даступнасць манаполек зрабіла б гэтую справу нерэнтабельнай. Дадзеныя наваўвядзенні патрабавалі пэўных змен у заканадаўстве.

26 чэрвеня 1898 г. Міністэрства Фінансаў распаўсюджвае цыркуляр за № 260 “О приговорах сельских обществ относительно воспрещения питейной торговли в пределах селений” [арк. 58 – 59]. Згодна з цыркулярам пастановы сельскіх сходаў, якія былі складзены да ўвядзення манаполіі павінны былі быць разгледжаны і выкананы, а вось на новыя пастановы накладаўся шэраг абмежаванняў. Былі пазбаўлены права забараняць на сваёй тэрыторыі продаж алкаголя паселішчы з насельніцтвам звыш 5000 душ, паселішчы дзе адбываліся кірмашы, меліся гандлёвыя і прамысловыя прадпрыемствы, а таксама тыя, што знаходзіліся пры чыгуначных станцыях, прыстанях і трактах, або дзе фіксаваліся выпадкі нелегальнага продажу.

Для тых паселішчаў, якія захавалі права на забарончыя пастановы пачыналіся бюракратычныя перашкоды. Разглядацца маглі толькі тыя пастановы, мэта якіх “действительно в стремлении местного населения противодействовать развитию пьянства”. Пастановы ўступалі ў моц па сканчэнню тэрміна арэнды (для дзяржаўных установ), ці патэнта (для прыватных асоб) пры ўзгадненні з губернатарам і ўпраўляючым Акцызнымі зборамі. У выпадку, калі між названымі асобамі ўзнікалі супярэчнасці, справа перадавалася ў Міністэрства Фінансаў. Максімальны тэрмін, на які накладалася забарона на функцыянаванне піцейных установ ці кропак продажу, вызначаўся на 3 гады, калі гэтага не было прапісана ў пастанове – то на год. У выпадку, калі ў мясцовасці фіксаваўся нелегальны продаж алкаголя, забарона скасоўвалася. На момант дзеяння забароны ўстановы продажу алкаголя маглі быць адчынены толькі на адлегласці 100 сажняў ад зямлі грамады [3, арк. 59].

Гэтыя меры значна ўскладнялі механізм ліквідацыі кропак продажу алкаголя, пастанова разглядалася шэрагам інстанцый, а калі ўсё ж бывала зацверджана, то прыходзілася чакаць завяршэння тэрміну арэнды – увесь гэты час кропка працягвала функцыянаваць. Шмат пастаноў заставаліся без адказу, ці былі не выкананы па фармальных прычынах. Так сяляне Селішчскай воласці Гарадоцкага павета ў 1903 г. прынялі пастанову зачыніць манапольку ў вёсцы Зарэчча ці перанесці яе ў іншае месца. Адначасова з падобнай заявай выступіў мясцовы святар, які апеліраваў тым, манаполька знахозіцца непадалёк ад могілак. Мясцовае папячыцельства аб народнай цвярозасці і Акцызнае ўпраўленне адмовілі ў гэтым з той фармуліроўкай, што ў Селішчы да манаполіі было 4 карчмы, адлегласць да могілак законная, а самі могілкі ўжо 20 гадоў як зачынены [4, арк. 148].

Сяляне Вазнесенскай воласці Полацкага павета 14 студзеня 1907 г. прынялі пастанову аб закрыцці ўсіх манаполек у воласці (№ 107 в. Селяўшчына, № 108 в. Кудзіна, № 109 в. Булыніна). Акцызнае Ўпраўленне адказала, што падстаў для гэтага няма – крамы даюць стабільны даход, а іх ліквідацыя можа выклікаць рост беспатэнтнага гандлю – які існуе і так, у якасці доказа – 4 пратакола на працягу 1903 – 1907 гг. Акрамя таго, арэндныя дамовы дзейнічалі да 1908, 1909 і 1913 гг., а ў воласці не было ніводнай прыватнай кропкі продажу. Як вынік, хадатайніцтва было адхілена губернатарам [5, арк. 173, 177].

У чэрвене 1908 г. Прыбыткоўскі сельскі сход Гарадокскага павета пастанавіў зачыніць манапольку ў фальварку Гараватке. Рэзалюцыя ўпраўляючага Акцызнымі зборамі па гэтаму пытанню датуецца лютым 1909 г. і сведчыць што манаполька знаходзіцца не на сялянскай зямлі, а належыць мяшчанцы Кальнін і ад сялянскіх сядзіб далёка, акрамя таго, у пратаколе не пазначана прычына, па якой сяляне жадаюць зачыніць манапольку – павінна быць супрацьдзеянне развіццю спажывання алкаголя [6, арк. 35 – 35 адв.].

Неэфектыўнасць пастаноў сялянскіх сходаў падштурхнула “Нашу ніву” да публікацыі спецыяльнага артыкула “Як рабіць прыгаворы аб закрыцці манаполек” (1908 г. № 15), дзе тлумачыліся як правільна, з юрыдычнага пункту гледжання, афармляць пастановы [7, с. 1]. У складзе III Дзяржаўнай думы дзейнічала Камісія па мерах барацьбы з п’янствам на чале з епіскапам Мітрафанам Гомельскім, галоўная праца якой была накіравана на выпрацоўку адпаведнага законапраэкта. Сярод яго пунктаў былі і тыя, што пашыралі магчымасці сельскіх грамад у сферы абмежавання п’янства. У першую чаргу законапраэкт даваў магчымасць мясцовым сходам прымаць забараняючыя прыгаворы, згодна з якімі ў адзначанай мясцовасці зачыняліся ўсе месцы продажу моцных алкагольных напояў. Аднаўленне продажу было магчыма толькі на пастанове новага сходу. Пры абмеркаванні гэтага пытання на сходах правам голаса надзяляліся не толькі сельскія гаспадары (якія і былі асноўнымі спажыўцамі алкаголя), але і іх жонкі і маці (якія больш за ўсіх цярпелі ад сыноў ды мужыкоў-п’яніц). Рашэнне прымалася па простай большасці галасоў, улічваючы толькі тых, хто з’явіўся на сход [8, с. 136-137]. Абмеркаванне законапраэкта выклікала бурную дыскусію, у 1911 г. ён быў накіраваны ў Дзяржаўны Савет, дзе так і не быў канчаткова прыняты.

Трэба адзначыць, што не ўсе пастановы сходаў аб закрыцці піцейных устаноў сведчылі аб жаданні сялян вырашыць праблему п’янства. Так, напрыклад, у 1902 г. сход Вярхоўскай воласці Віцебскага павета выдаў пастанову зачыніць манапольку ў вёсцы Слабада, бо з прычыны вялікай колькасці п'яных прыходзілася ўтрымліваць шматлікую варту: “2 полицейских десятских, 1 сотского и 1 дежурного старшину” [9, арк. 27]. У закрыцці манапольки было адмоўлена, бо прычына прыняцця пастановы не адпавядала барацьбе з п’янствам, а насіла эканамічны характар. Падобны выпадак здарыўся ў лютым 1909 г., калі адмоўлена Бабініцкаму валасному сходу Віцебскага павета ў закрыцці манапольки ў Бабінічах – вёска ляжыць на тракце з Віцебска ў Веліж і манаполька патрэбна не толькі мясцовым, але і праезжым, а сяляне падпісалі пратакол пасля таго, як земскі начальнік загадаў арганізаваць ахову манапольки – не пажадалі несці службу ці плаціць грошы [6, арк. 37].

У студзені 1907 г. сялене в. Сямёнава Дрысенскага павета падпісалі прыгавор аб закрыцці віннай крамы. Акцызнае ўпраўленне пачало расследванне. Выявілася, што з з 19 гаспадароў 8 былі не супраць манапольки, але 2 на сход не прыйшлі. Папярэдняе даследванне прыйшло да высновы, што прычына прыгавора – быццам бы – жаданне сялян атрымліваць 30 руб. арэндных грошай у год, замест 10 раней і размяркоўваць паміж усімі гаспадарамі, а ініцыятарам працэса выступаў пісар незадаволены тым, што яму ў п’яным выглядзе не прадалі гарэлку тады, калі крама была зачынена. Сама ж крама аніякай шкоды не прыносіць [5, арк. 161]. У такім выглядзе справа была перададзена губернатару, той звярнуўся да земскага начальніка. Па сведчанню апошняга існаванне крамы прыносіла шкоду грамадзе, пісар ў гэтым працэсе ініцыятывы не праяўляў, справа арэнды была, але сума 30 руб. прапаноўвалася самім уласнікам крамы. Сяляне ж не

дамовіліся ў размеркаванні. Дадзеная справа вырашылася сама па сабе - уласнік крамы перанёс яе ў суседнюю вёску Гаціха [5, арк. 165 - 166].

Такія факты паўплывалі на адносіны як тагачасных улад, так і часткі даследчыкаў да пастаноў аб закрыцці манаполек. Да пастаноў ставіліся насцярожана, шукаючы ў іх прыкметы змовы з нелегальнымі гандлярамі, акрамя таго ліквідацыя манаполек супярэчыла фіскальным інтарэсам дзяржавы.

Карэнныя змены ў дзяржаўнай палітыцы адбыліся ў пачатку 1914 г. Перад новым міністрам фінансаў П.Л. Баркам Мікалай II паставіў задачу выпрацаваць дзейсныя меры па скарачэнню п'янства і рэфармавання сістэмы дзяржаўнай віннай манаполіі. 19 красавіка 1914 г. начальнік Галоўнага Ўпраўлення неакладных збораў і казённага продажу піцей выдаў цыркуляр, дзе адзначалася, што галоўнай задачай мясцовых органаў акцызнага нагляду павінна стаць зацвярджэнне сярод насельніцтва цвярозасці, а садзейнічанне скарачэнню месц гандлю з'яўляецца бліжэйшым спосабам гэтага [10, арк. 47]. Улады больш пазітыўна адносіліся да запытаў насельніцтва.

Прыняцце пастаноў аб закрыцці мапаполек, корчмаў і піўных набывае масавы характар. У Мінскай губерні на працягу мая – чэрвеня 914 г. прыгаворы аб закрыцці піцейных устаноў у 170 вёсках. Некаторыя грамады бралі на сабе абавязак сачыць за таемным продажам.

Да некаторых сельскіх грамад дадзеныя змены сталі магчымасцю вырашыць набалелыя пытанні. Сялене Барковіцкай грамады (Філіпаўская воласць, Дрысенскі павет) звярталіся да губернатара ў 1912 і 1913 гг. з просьбай зачыніць карчму, абодва разы беспаспяхова, бо карчма знаходзілася на адлегласці ½ вярсты ад сялянскіх надзелаў. Новае прашэнне ад 4 сакавіка 1914 г. было ўхвалена [3, арк. 24 – 26].

Хваля пастаноў аб ліквідацыі піцейных устаноў выклікала пратэст з боку зацікаўленых асоб. У лісце да губернатара селянін Лепельскага павета в. Гарадчэвічы Рыгор Ахрэмееў прасіў не закрываць казённую краму, бо яна знаходзілася ў яго доме і давала прыбытку 120 руб. у год арэндай. "Таковая вовсе не вредна, тем более крестьянской волости" – пазначаў ён і працягваў, што шмат каго з сялян пры падпісанні пратакола не было, а жаданне ліквідаваць краму атаесамляў з жаданнем пазбавіць яго даходу [3, арк. 10].

У прашэнне сялян Паддубскай грамады (Віцебскі павет) адзначалася, што сход быў скліканы па пытанню будаўніцтва агароджы вакол царквы, але нечакана было зададзена пытанне аб закрыцці казённай віннай крамы і піўной. За выказалася некалькі чалавек, астатнія маўчалі, бо не былі падрыхтаваны. Пад пастановай схода некалькі пісьменных сялян падпісаліся за ўсіх. Нязгодныя прасілі заставіць на першы час піўную, бо "совсем прекратить потребление всяких напитков невозможно" [3, арк. 20].

У в. Крупіца (Самахвалавіцкая воласць, Мінскі павет) сядзелец (прадавец) і адначасова уладальнік хаты, дзе месцілася манаполька Тамаш Шакура частаваў сялян, каб тыя не рабілі пастанову, але тыя "яшчэ больш загаварылі, што манапolькі не трэба". Сядзелец даведаўшыся "рукі заламаў, загаласіў, як матку пахаваўшы". Ініцыятарамі прыняцця пастаноў выступаліся часцей за ўсё прадстаўнікі мясцовай адміністрацыі, у сувязі з чым ёсць верагоднасць, што дадзеныя рашэнні маглі прымацца ў сувязі з жаданнем апошніх адпавядаць новым тэндэнцыям дзяржаўнай палітыкі, ці выслужыцца перад вышэйстаячым кіраўніцтвам. Часам і сяляне бачылі ў гэтых дзеяннях нейкі патаемны сэнс. У в. Мікалаеўшчына (Мінскі павет) большасць сялян выказалася супраць ліквідацыі манапольkі, апелюючы наступнымі тэзісамі: "Распішыся, дык новы налог увядуць заміж манапольkі, Закрый манапольку, ешчэ больш пойдзе п'янства, тайком будуць трымаць яе. У нас яе не так многа і п'юць". Чуткі пра новыя падаткі - па 6 руб. з хаты - не далі магчымасці прыняць пастанову ў Лынтупах (Свянцянскі павет) [14, с. 4]. Для насельніцтва насамрэч было незразумела, чаму ўлады пагадзіліся на ліквідацыю манаполек, крыніц немалога прыбытку, якія раней надзейна ахоўвалі.

Далейшае развіццё падзей прывяло да таго, што працэдура прыняцця пастаноў аб абмежаванні п'янства стала непатрэбнай. З пачаткам Першай сусветнай вайны былі ўведзены абмежаванні на продаж гарэлкі. 23 жніўня 1914 г. забарона на продаж моцных напояў была працягнута да канца ваеннага часу, а 20 верасня 1914 г. Мікалай II афіцыйна

абвясціў аб рашэні спыніць продаж гарэлкі назаўжды [15, с. 3]. 4 лістапада 1914 г. Упраўленне акцызных збораў Міністэрства фінансаў распаўсюдзіла цыркуляр, які пачынаўся словамі: “для ліквідацыі спакусы да п'янства, які да гэтага часу ствараўся Празмернае колькасці месцаў продажу піцей як у гарадах, так і ў сельскай мясцовасці, колькасць месцаў продажу неабходна вельмі і вельмі паменшыць”. У сельскай мясцовасці ў паселішчах, якія не вызначаліся ні колькасцю жыхароў, ні гандлёвым або прамысловым значэннем, з 1 студзеня 1915 г. продаж моцных напояў цалкам забараняўся. Калі раней для сялян цвярозасць была справай індывідуальнага і калектыўнага выбару, то 1915 г. стаў для іх пачаткам “прымусовай цвярозасці”.

Такім чынам, аналізуючы ролю пастаноў сельскіх сходаў у барацьбе з п’янствам, можна адзначыць, што дадзены механізм даваў сялянам магчымасць пазбавацца ў сваёй мясцовасці ад кропак продажу алкагольных напояў, але быў значна абмежаваны ва ўмовах дзяржаўнай віннай манаполіі. Разам з гэтым, пастановы аб закрыцці манаполек і корчмаў не заўсёды адпавядалі ідэям цвярозасці, і прымаліся пад уздзеяннем эканамічныхі іншых фактараў. Змены ў дзяржаўнай палітыцы садзейнічалі актывізацыі прыняцца пастаноў у 1914 г., што, аднак, адбывалася ў тым ліку і за кошт адміністрацыйнага рэсурса. Пачатак Першай сусветнай вайны прывёў да забароны продажу моцных напояў у сельскай мясцовасці ўжо без уліку жадання саміх сялян.


1. Фридман, М.И. Винная монополия: Винная монополия в России. Т.2. / М.И. Фридман. – Петроград, 1916. – 681 с.
2. Цитович, П. Питейная монополия помещиков Польши в своих имениях / П. Цитович. – Санкт-Петербург: Типография В.Ф. Киршбаума, 1907. – 379 с.
3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ) – Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 49037.
4. НГАБ. – Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 45837.
5. НГАБ. – Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 47263.
6. НГАБ. – Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 47604.
7. Наша ніва. – 1908. – № 15.
8. Митрофан, В борьбе за трезвость / Епископ Митрофан, - Минск.: Мин. Православ. Свято-Николаев. нар. Братство, 1913 – 190 с.
9. НГАБ. – Ф. 2709. – Воп. 1. – Спр. 54.
10. НГАБ (Гродна). – Ф. 30. – Воп. 1. – Спр. 604.
11. Наша ніва. – 1914. – № 25 – 26.
12. Наша ніва. – 1914. – № 23.
13. Наша ніва. – 1914. – № 27.
14. Наша ніва. – 1914. – № 29.
15. Бородин, Д.Н. В защиту трезвости (по поводу домогательств пивоваров и виноделов) / Д.Н. Бородин. – Петроград, 1915. – 25 с.
16. НГАБ (Гродна). – Ф. 30. – Воп. 1. – Спр. 447.


## RESOLUTION OF THE VILLAGE ASSEMBLY OF BELARUSIAN PROVINCES ON THE LIMITATION OF DRINKING IN THE LATE XIX - EARLY XX CENTURIES: THE MECHANISM OF ACTION AND THE PROBLEM OF INTERPRETATION


***Siarhei Mianchenia***

*Belarusian State Agrarian Technical University, Minsk, Belarus*

men_sv@tut.by



**Summary:** The article describes the evolution of the mechanism of the ban sale of thealcoholic beverages in rural areas and the state policy in relation to these regulations. These regulations ambiguously perceived by scientists, since they do not always conform to the ideas of struggle against drunkenness and to be influenced by economic factors and the administrative burden.



***Keywords: drunkenness, village assemblies, wine monopoly***


Репозиторий ПолесГУ